тен», сколько своего рода эмоциональным «переживанием прошлого», высокой степенью политической вовлеченности и селекции исторического знания в процесс формирования новой национальной государственности и национальной идентичности [12].

Итак, новые времена рождают новые взгляды и оценки на исторические события прошлого, связанные с использованием новых методологических подходов. Это стало возможным в связи с освобождением от идеологического прессинга коммунистического режима и навязывания идеологических канонов государственной идеологией. Уровень развития современной исторической науки позволяет взглянуть на проблему по-другому.

Как видится, абсолютное зло, наименьшее зло, колониализм, царизм, шовинизм, геноцид, этноцид - вот определенный интеграл, т.е. матрица научных суждений о смысле российского феномена в казахстанском пространстве, которые недостаточно раскрывают сущность обозначенной проблемы. С другой стороны, «цивилизаторская миссия», «абсолютное благо», «преимущество вхождения» и т.д. также не являются достаточно объективными. Для создания реальной исторической картины колониальной практики, объективного исследования неоднозначной, противоречивой сложности колониального прошлого, на наш взгляд, требуется своевременное овладение новейшим методологическим потенциалом и современным исследовательским методическим инструментарием, обращение к концептуальным наработкам. Эти вопросы остаются открытыми. Появление более совершенного теоретического и познавательного инструментария требуют более адекватного приложения исследовательских усилий.


1. История// Thesis. 1994.-С.158.
2. Козыбаев М.К. История и современность. А-Ата, 1991; История Казахстана: Белые пятна. Сб. статей. А-Ата, 1991; История Казахстана с древнейших времен до наших дней. Очерк. Алматы, 1993; Казахстан в начале XX века: методология, историография, источниковедение. Алматы, 1993; История Казахстана в лицах (Политические портреты). Акмола, 1993.
3. Козыбаев М.К. Казахстан на рубеже веков: Размышления и поиск. Алматы, 2000.- С.- 100.
4. Галиев В.З. Национально- освободительное движение казахского народа в свете новых исследований.// Мысль, 1993, №11, С.-77-81.
5. Мажитов С.Ф. Вопросы методологии изучения методов и характера колониального господства России в контексте истории Казахстана начала XX века// Казахстан в начале XX века: методология, историография, источниковедение. Сборник статей. – Алматы, 1994, Вып.2, С.62-71.
6. Жакыпбек С.К. «Казакстанды патшалык Ресейдин отарга айналдруын студенттерге калай окыту керек//Материалы международной научно-практической конференции, посвященной 70-летию Казахского национального университета имени Аль-Фараби. 21-22 октября, 2004г., Ч. 1, 2 – Алматы, 2004.
7. Несипбаева К.Р. Современная англо-американская историография русской экспансии и колонизации Центральной Азии и Казахстана (XVIII- начала XX вв.).- Алматы: Казак университетi.- 1997.-191с.
8. Масанов Н.Э., Абылхожин Ж.Б., Ерофеева И.В. Научное знание и мифотворчество в современной историографии Казахстана. Алматы: «Дайк - Пресс», 2007-296с. – С 11-13.
9. Аманжолова Д. На изломе. Алаш в этнополитической истории Казахстана. – Алматы: Издательский дом «Таймас».2009.-С.18.
10. Материалы международной конференции «Историческая наука постсоветской Центральной Азии: обретения и проблемы. - Алматы, 29-30 сентября 2005.
11. Миллер А. Империя Романовых и национализм. Эссе по методологии исторического исследования. М, 2006.- С.21.
12. Ремнев А.В. Новая имперская история: проблемы исследования и преподавания// Материалы международной конференции: Образовательно-инновационная и социокультурная политика в Казахстане и сопредельных территориях: опыт, проблемы и перспективы. Астана, Евразийский гуманитарный институт, 2005; Он же: Региональный нарратив в новой имперской истории Росии//Этнопанорама. Оренбург, 2005, №3-4, С.35-42; Он же: Имперская история Азиатской России в национальном и региональном нарративах//Степной Край Евразии: историко-культурные взаимодействия и современность. Тезисы докладов и сообщений VI Международной научной конференции.- Омск, 2009.- 6-11.



**Паўлава А.Я.**


## КРЫНІЦАЗНАЎСТВА НА СТАРОНКАХ "БЕЛАРУСКАГА ГІСТАРЫЧНАГА ЧАСОПІСА" ў канцы 1990-х – 2011 гг.

Вядучым дзяржаўным гістарычным выданнем з 1993 г. з'яўляецца "Беларускі гістарычны часопіс". На сваіх старонках ён спрабуе сумясціць навуковыя, навукова-папулярныя і вучэбна-метадычныя тэксты. Па меркаваннях рэдакцыі найбольш важнай пры выбары тэкстаў для публікацыі з'яўляецца практычная накіраванасць матэрыялаў (магчымасць вы-

Репозиторий ВГУ

карыстання ў сферы адукацыі). Такім чынам, калі пераасэнсаваць формулы “Без крыніц няма гісторыі” і “Гісторыя пішацца па дакументах. Няма іх – няма гісторыі”, то публікацыі крыніцазнаўчага накірунку з’яўляюцца вельмі актуальнымі для часопіса.

У дадзеным артыкуле прапануецца кароткі агляд вынікаў прац беларускіх і замежных гісторыкаў, апублікаваных на старонках “Беларускага гістарычнага часопіса”. На працягу апошніх 15 гадоў на старонках БГЧ было апублікавана і каля 40 артыкулаў, прасвечаных праблемам крыніцазнаўства. Аўтарамі матэрыялаў з’явіліся навукоўцы Інстытута гісторыі, Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук, вядучых ВНУ, архіўных і музейных устаноў Рэспублікі Беларусь. Калі гаварыць пра тэматычнае напаўненне, то гэта аналіз асобных груп крыніц, паведамленні аб архіўных крыніцах, комплексныя даследаванні крыніц па вызначаных гістарычных пытаннях, публікацыі тэкстаў крыніц і характарыстыка становішча з вывучэннем крыніцазнаўства ў беларускіх ВНУ. Аўтары артыкулаў прадэманстравалі навуковую цікавасць не толькі да традыцыйна папулярных пісьмовых і археалагічных, а таксама да рэчавых, выяўленчых, картаграфічных крыніц. І ўсё ж, асноўная частка матэрыялаў прысвечана разгляду вынікаў вывучэння пісьмовых крыніц, а менавіта апавядальным крыніцам. Абсалютная большасць артыкулаў была апублікавана ў перыяд 2004 – 2011 гг. Вынікі навуковых даследаванняў друкаваліся не толькі ў спецыяльным раздзеле “Крыніцазнаўства”, а таксама ў раздзелах “Гісторыя культуры”, “Археалогія”, “Гісторыя архітэктуры”, “Беларусы ў свеце”, “Мастак і гісторыя”, “Ваенная гісторыя”, “Краязнаўства”, “Матэрыялы да ўрокаў”. Тэксты ўсіх артыкулаў падрыхтаваны на беларускай мове.

Пачнем агляд з публікацый дакументаў. За азначаны перыяд у часопісе былі надрукаваны дакументы аб стварэнні БДУ, утварэнні ССРБ, выявы графіці XII-XIV стст. у Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку, грамата князя Васіля Нарымонтавіча канца XIV ст., апісанне падарожжа з Мінска ў Пецярбург у 1797 г. ананімнага беларускага шляхціца, даклад лідара Беларускай хрысціянскай дэмакратыі А.Станкевіча “Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы”, лісты Філона Кміты-Чарнабыльскага і Льва Сапегі, тэксты Полацкага летапісу і “Аповяда пра Усеслава Чарадзея”, рапарты войскаў вермахта перыяда абароны г.Магілёва ў ліпені 1941 г. і інш.

Матэрыял дацэнта кафедры крыніцазнаўства БДУ М.Ф.Шумейкі прысвечаны пытанням традыцый выкладання крыніцазнаўства і спецыяльных гістарычных дысцыплін пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне архівазнаўства і дакументазнаўства [27].

Усё больш увагі даследчыкаў прыцягваюць фотадакументы. Паведамленне А.М.Міхальчанкі прысвечана разгляду фотадакументаў БелТА у якасці крыніц па гісторыі Беларусі [16]. Матэрыял В.А.Лабачэўскай расказвае пра этнаграфічную фотакалекцыю з Беларусі на Усерасійскай этнаграфічнай выстаўцы 1867 г. У аснову наступнага артыкула гэтай жа даследчыцы пакладзены знойдзены ў іканаграфічным аддзеле Нацыянальнага музея Літвы фотаздымак саламяных царскіх варот з Піншчыны. В.А.Лабачэўская паспрабавала высветліць не толькі гісторыю і лёс узнікнення гэтай фотакрыніцы, а і самаго помніка народнага мастацтва [9,10 ].

У асобную групу можна выдзеліць паведамленні пра архіўныя. крыніцы.Так, у 2006 г. выйшлі артыкулы В.С.Івановай “Першая сусветная вайны ў дакументах беларускіх архіваў” і А.Латушкіна “Нясвіжскі архіў Радзівілаў ( 1838 – 1873 )”. У 2008 г. убачыў свет матэрыял дырэктара НГАБ ў Мінску А.К.Галубовіч “Скарбніца дакументальнай спадчыны”. На думку аўтараў, час ставіць перад гісторыкамі новыя праблемы, даследаванне якіх немагчыма без ўвода ў навуковы зварот новых дакументальных крыніц, на якія так багаты айчынныя архіўныя ўстановы.

Сярод комплексных крыніцазнаўчых даследаванняў пэўных праблем айчыннай гісторыі неабходна выдзяліць артыкул супрацоўніцы Інстытута гісторыі НАНБ І.У.Ганецкай “Крыніцы па гісторыі беларускіх замкаў”. Аўтар ўпэўнена, што выкарыстанне розных відаў крыніц і метадаў даследавання павялічвае навуковую каштоўнасць работ. У артыкуле прадстаўлены вынікі вывучэння гісторыі беларускіх замкаў на

Рэпазіторый ВДУ

падставе пісьмовых, археалагічных, картаграфічных, іканаграфічных, вусных крыніц і фотадакументаў [ 2].

В.Ф.Голубеў прадставіў артыкул “Крыніцы па гісторыі сельскай абшчыны ў Беларусі ў XVI-XVIII стст.” Матэрыялаў, прысвечаных выключна дзейнасці сялянскай абшчыны на беларускіх землях у XVI-XVIIIст. няма. У разглядаемы перыяд абшчына на тэрыторыі ВКЛ з’яўлялася грамадскай арганізацыяй сельскага насельніцтва. Звесткі пра яе існаванне ў большасці крыніц ускосныя. Аўтарам не выяўлена ні воднага дакументы, які б даваў усебаковую характарыстыку сельскай абшчыны ў Беларусі ў вывучаемы перыяд. Тым не меньш, даследчык зрабіў класіфікацыю крыніц па намінальнальнаму прызнаку (выдзелена 10 відаў дакументаў), дзе можна сустрэць неабходныя звесткі. У працэсе вывучэння высветлілася,што абсалютная большасць крыніц паходзілі ад пануючага саслоўя феадалаў-уласнікаў. Кожны дакумент вырашаў пэўную задачу, неабходную яго аўтарам. Але існавалі і дакументы, якія сведчылі пра захаванне пэўных норм і правіл грамадскага жыцця ў вёсцы [ 3 ].

Выклікае цікавасць і матэрыял В.Б.Келер і С.Б.Каўна “Вялікае Княства Літоўскае ў нямецкіх выданнях другой паловы XVII – пачатку XVIII ст”. У артыкуле прыведзены вынікі вывучэння выданняў, якія зберагаюцца ў Цэнтральнай бібліятэцы зямлі Заксен Ангальт [ 8 ].

Значная колькасць публікацый складаюць матэрыялы аб гісторыі кніжных збораў як гістарычных крыніц. Так, В.А.Варонін у артыкуле “Кніга светого Софея” разгледзеў гісторыю захавання ў XV-XVI стст. Самых значных кніжных збораў Полаччыны і іх далейшы лёс. Серыя паведамленняў галоўнага захавальніка Веткаўскага музея народнай творчасці С.І.Лявонц’евай прысвечана асаблівасцям мастацкага афармлення Веткаўскіх рукапісных кніг XVIII ст. [12,13,14]. Ю.М.Лаўрык аналізуе рукапісныя кнігі ў Куцейне.

Прыцягвае ўвагу і артыкул Н.А.Скепьян, якая звярнулася да вывучэння такога віду выяўленчых крыніц як выявы дзяржаўных дзеячоў . Даследчыца правяла параўнальны аналіз выяў канцлераў ВКЛ першай паловы XVI ст. на партрэтах, мініяцюрах з малітоўнікаў і каменных надмагільных помніках [ 17 ].

Дастатковая колькасць паведамленняў закранае праблемы вывучэння археалагічных крыніц. Напрыклад, паведамленне В.У.Мядзведзевай прысвечана рэалістычным шахматным фігурам ў Беларусі ў часы Сярэднявечча. Як пазначае аўтар, па матэрыялах атрыманых беларускімі археолагамі можна зрабіць высновы, што нашыя продкі выдзяляліся высокай шахматнай культурай. На тэрыторыі Беларусі знойдзены амаль усе фігуры рэалістычных шахмат акрамя слана і каня [ 17 ].

Асобнае месца займаюць публікацыі палеаграфічнага накірунка. Так, трэба адзначыць матэрыял А.І.Грушы “Рэлігія – мова – пісьмо: пра сутнасць устава і паўустава XI – першай паловы XVIст.” [5]. У паведамленнях І.Л.Калечыц markup рознабакова разглядаюцца эпіграфічныя помнікі: графіці на сякере з Музея Беларускага Палесся ў Пінску і графіці XII – XIV стст. У Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку [ 6,7 ].

Аналіз дакументальных пісьмовых крыніц, акрамя вышэй азначанага артыкула В.Ф.Голубева, прадстаўлен у рабоце А.І.Грушы “Невядомы арыгінал граматы князя Васіля Нарымонтавіча канца XIV ст.” [4 ] .

Адной з цэнтральных тэм для беларускіх навукоўцаў-крыніцазнаўцаў з’яляецца вывучэнне апавядальных крыніц: летапісаў, лістоў, дзённікаў. Пастаянным аўтарам БГЧ можна назваць літаратуразнаўца І.В.Саверчанку. На працягу азначаннага перыяда ім былі прапанаваны артыкулы “Рарытэт нацыянальнай гістарыяграфіі і літаратуры” – аб летапісных паведамленнях “Аповяды пра Усеслава Чарадзея”, “Полацкі летапіс – галоўная крыніца палітычнай гісторыі Беларусі XIIст.”, “Пісьмовая спадчына Льва Сапегі” – аб выніках вывучэння 300 лістоў, “Эпісталярная спадчына Філона Кміты-Чарнабыльскага” [22,23,24,25]. Трэба адзначыць, што лісты гэтага дзяржаўнага і ваен-

нага дзеяча прыцягнулі навуковую ўувагу і маладога даследчыка Ю.М.Мікульскага, які рыхтуе да археаграфічнага выдання зборнік лістоў прыгаданай знакамітай асобы [15]. У фокусе даследчыцкай увагі Ю.Л.Казакова і Б.Рока знаходзяцца запіскі падарожнікаў. Адпаведна, прыгаданымі аўтарамі быў прадсталены артыкул "Апісанне падарожжа з Мінска ў Пецярбург ананімнага беларускага шляхціца".

Крыніцазнаўства гісторыі ХХ стагоддзя прадстаўлена артыкуламі, ў якіх на падставе шырокага выкарыстання крыніц падаецца аналіз войнаў і іх наступстваў для Беларусі. Так, падзеі Першай сусветнай вайны прадстаўлены матэрыяламі М.Ліс "Фатаграфіі У.Паўлоўскага – дакументальнае сведчанне Першай сусветнай вайны" і С.С.Рудовіча "Вайна, палітыка, паўсядзённасць у "Дзённіку" Фердынанда Рушчыца". Падсумоўваючы разгляд дзённікавых запісаў вядомага мастака за 1914 – 1919 г. аўтар публікацыі адзначае шматпланавасць і шматаспектнасць інфармацыі, якой пры гэтым уласціва характэрная для дзённікаў мазаічнасць і незавершанасць сюжэтаў.З пункту гледжання інфармацыі выдзяляюцца два пласты. Першы – непасрэдныя ўражанні мастака пра падзеі, у якіх ён удзельнічаў непасрэдна або назіраў асабіста: штодзённае жыццё пад акупацыяй у асяроддзі шляхецкага маёнтка, а таксама дзейнасць Ф.Рушчыца як польскага краёўца. Другі пласт складаюць водгукі аўтара на больш маштабныя працэсы, паваротныя моманты ў гісторыі Першай сусветнай вайны [11, 21] .

У цэнтры ўвагі даследаванняў С.Я.Новікава знаходзяцца падзеі гісторыі Беларусі перыяда Вялікай Айчыннай вайны, а менавіта абарона г.Магілёва летам 1941 г. Раздляду азначанных падзей гісторык прысвяціў наступныя артыкулы: "Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. у нямецкіх архіўных дакументах", "Абарона Магілёва у святле новых дакументальных крыніц" і "Магілёўская бітва 1941 г.". Гісторык перакананы, што адметнай рысай сучасных даследаванняў павінна стаць шырокае выкарыстанне нямецкіх архіўных дакументаў, без якіх практычна немагчыма адказаць, у прыватнасці на асобныя пытанні бітвы за Магілёў летам 1941 г. Аўтар прыходзіць да высновы, што нямецкія дакументы сведчаць аб існаванні на Дняпры "непрыступнага басціёна", "баяздольнай крэпасці", за якую ў ліпені 1941 г. разгарнулася сапраўдная бітва. Па меркаваннях С.Я.Новікава гэтыя факты павінны стаць для беларускай грамадскасці перакаўчай падставай для таго, каб прысвоіць г.магілёву ганаровае званне "Горад-герой" [18,19,20].

Тэма партызанскага руху знайшла адлюстраванне ў матэрыяле Т.В.Букінай "Партызанскія часопісы як з'ява ў агітацыйным мастацтве Беларусі", падрыхтаваны на аснове аналізу калекцыі дадзеных крыніц у фондах БДМГВАВ. Даследчыца спыняецца на партызанскіх часопісах як асобным віду гістарычных крыніц па гісторыі партызанскага руху: у часопісах спалучаліся функцыі дакументавання і агітацыі і прапаганды. Прадметам дэталёвага разгляду стала выяўленчае мастацтва на старонках часопісаў і гістарыяграфія вывучэння гэтага віду крыніц. Артыкул быў надрукаваны ў раздзеле "Матэрыялы для ўрокаў". Аднак, ён можа быць выкарыстаны і пры падрыхтоўцы навуковых прац [1].

Падсумоўваючы агляд публікацый па крыніцазнаўству на старонках вядучага галіновага часопіса, неабходна адзначыць, што праца з крыніцамі застаецца для гісторыкаў адным з галоўных напрамкаў навуковых пошукаў. Актыўны пошук дадатковых крыніц і спробы новага іх прачытання сведчаць, што значная частка даследчыкаў не вельмі задаволена станам распрацоўкі асобных пытанняў гісторыі краіны.

Тым не меньш, трэба прызнаць што на сёняшні дзень "Беларускі гістарычны часопіс" выдае вялікую колькасць невялікіх артыкулаў па дастаткова вузкім праблемам і без прэтэнзій на канцэптуальнасць. Практычна адсутнічаюць палемічныя матэрыялы. Нажаль, няма артыкулаў па тэарэтычных пытаннях крыніцазнаўства. Спадзяёмся, што становішча выправіцца ў бліжэйшай будучыні.

1. Букіна Т.В. Партызанскія часопісы як з'ява ў агітацыйным мастацтве Беларусі. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. - №11. – С.60 - 66.

Рэпазіторый БДУ

2. Ганецкая І.У. Крыніцы па гісторыі беларускіх замкаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. - №9. – С.17 -23.
3. Голубеў В.Ф. Крыніцы па гісторыі сельскай абшчыны ў Беларусі ў XVI – XVIII стст.//Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. - №10. – С.24 -30.
4. Груша А.І. Невядомы арыгінал граматы Васіля Нарымонтавіча канца XIV ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. - №11. – С.31-42.
5. Груша А.І. Рэлігія – мова – пісьмо: пра сутнасць устава і паўустава XI – першай паловы XVI ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №9. – С.28-31.
6. Калечыц І.Л. Графіці XII – XIV стст. У Спаса-Праабражэнскай царкве у Полацку // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. - №7. – С.37 -46.
7. Калечыц І.Л. Сякера з Музея беларускага Палесся: невядомы эпіграфічны помнік // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - №7. – С.28-31.
8. Каўн С.Б., Келер В.Б. Вялікае Княства Літоўскае ў нямецкіх выданнях другой паловы XVII – пачатку XVIII стст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. - №1. – С.67 -71.
9. Лабачэўская В.А. Саламяныя царскія вароты: новая знаходка. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. - №4. – С.24 -27.
10. Лабачэўская В.А. Этнаграфічная фотакалекцыя з Беларусі на Усерасійскай этнаграфічнай фотавыстаўцы 1867 г. Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №4. – С.32-37.
11. Ліс. М. Фатаграфіі У.Паўлоўскага – дакументальнае сведчанне Першай сусветнай вайны. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. - №8. – С.44-49.
12. Лявонцьева С.І. Мастацтва рукапіснай кнігі Веткі і народная творчасць // Беларускі гістарычны часопіс. – 2009. - №2.
13. Лявонцьева С.І. Мастацкае афармленне Веткаўскіх рукапісных кніг XVIII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №4. – С.22-32.
14. Лявонцьева С.І. Мастацкае афармленне Веткаўскіх рукапісных кніг XVIII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - №9. – С.22-32.
15. Мікульскі Ю.М. Новыя лісты Філона Кміты-Чарнабыльскага.// Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. - №10. – С.18-23.
16. Міхальчанка А.М. Фотадакументы БелТА як гістарычная крыніца. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2000. - №4. – С.32-35.
17. Мядзведзева В.У. Рэалістычныя шахматныя фігуры сярэднявяковай Беларусі. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. - №4. – С.41-45.
18. Новікаў С.Я. Магілёўская бітва 1941 года ў данясеннях Вермахта. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. - №7. – С.23 -34.
19. Новікаў С.Я. Абарона Магілёва ў святле новых дакументальных крыніц. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. - №7. – С.44 -53.
20. Новікаў С.Я. Адлюстраванне падзей на Буйніцкім полі 12 ліпеня 1941 г. у нямецкіх архіўных матэрыялах. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №7. – С.12 -19.
21. Рудовіч С.С. Вайна, палітыка, штодзённасць у "Дзённіку" Ф.Рушчыца. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №10. – С.37 -45.
22. Саверчанка І.В. "Полацкі летапіс" – галоўная крыніца палітычнай гісторыі Беларусі XII ст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. - №5. – С.13-18.
23. Саверчанка І.В. Пісьмовая спадчына Льва Сапегі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. - №3. – С.3 - 11.
24. Саверчанка І.В. Рарытэт нацыянальнай гістарыяграфіі і літаратуры // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №11. – С.32-36.
25. Саверчанка І.В. Эпісталярная спадчына Ф.Кміты-Чарнабыльскага. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. - №5. – С.29-33.
26. Скепьян Н.А. Выявы канцлераў ВКЛ першай паловы XVI стагоддзя як гістарычная крыніца . // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №5. – С.30-33.
27. Шумейка М.Ф. Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны на гістарычным факультэце БДУ: гісторыя і сучаснасць. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. - №4. – С.27-30.

**Трыгорлава Л.Б.**

## ХРЭСТАМАТЫЯ Ў ШКОЛЬНЫМ ГІСТАРЫЧНЫМ КУРСЕ: РОЛЯ І ТЭХНАЛОГІЯ АДПРАЦОЎКІ ТЭКСТУ

Вывучэнне гісторыі ў школьным курсе гісторыі, асабліва на старэйшай ступені адукацыі, цесна звязана з выкарыстаннем дакументальнага матэрыялу. А рост цікавасці вучняў да шматвяковага шляху, пройдзенаму беларускім народам за сваю гісторыю, адчуваецца сёння асабліва востра. Сапраўды, азнаямленне вучняў непасрэдна з пісьмовымі крыніцамі дапамагае ім як бы прыадкрыць дзверы ў мінулае, разгледзіць з'явы ў першазданным выглядзе, адчуць пульс гістарычнага працэсу. Таму выкладанне гісторыі павінна абапірацца на факты, якія ўтрымліваюцца ў дакументах. Выключную ролю ў гэтым працэссе адыграюць хрэстаматыі па гісторыі Беларусі (для 10 класа пад рэдакцыяй А. А. Кавалені, 2009 г.; для 11 класа – складальнікі В. М. Фамін, С. В. Паноў, Т. Ф. Ходзіна, 2009 г.). Галоўная мэта хрэстаматый – спрыяць больш глыбокаму і

Рэпазіторый ВДУ